

# «З ракі маёй памяці»

## Літаратурна-краязнаўчая гасцёўня па творчасці В. Супрунчука

*На фоне інструментальнай музыкі дэманструюцца слайды родных краявідаў вёскі.*

**Вядучы 1.** У кожнага чалавека ёсць куточак, асабліва дарагі і мілы яго сэрцу. Гэта месца, дзе ён нарадзіўся.

У адным з эсэ Віктара Пятровіча Супрунчука мы знойдзем адрас яго малой радзімы.

**Чытальнік 1.**

*«Я нарадзіўся на Ясельдзе, прыгожай і светлай, пра якую незабыўная і таленавітая Яўгенія Янішчыц напісала:*

*Шуміць рака, нібыта глыбы*
*Варочае, каб не прыстаць.*
*І туманы над ёй, як выбух,*
*Падоўгу раніцай вісяць.*

*...мне некалі Жэня гаварыла: у кожнага з нас ёсць свая рака памяці. Здаецца, што мая падобная на тую срэбрабруйную і ласкавую Ясельду, у якую я малым скакаў гарачымі летнімі днямі... Я чэрпаю з маёй памяці ўспаміны, нібы з ракі прыгаршчамі ваду...»*

***Віктар Супрунчук. З ракі маёй памяці***

**Вядучы 2.** Паважаныя госці! Запрашаем усіх павандраваць разам з аўтарам па той шырокай кніжнай рацэ, якая льецца тысячамі друкаваных старонак твораў пісьменніка-празаіка Віктара Супрунчука, лаўрэата літаратурнай прэміі імя Івана Мележа, а для чытачоў бібліятэк Бярозаўшчыны — проста таленавітага земляка, мастака слова, які ўносіць у літаратурную скарбонку беларускай прозы мноства яскравых, запамінальных вобразаў.

**Чытальнік 2.**

*Сцежкі маленства, сцежкі маленства!*
*Вы — лекі ад розных людскіх калецтваў.*
*Па вашай траве, па вашых росах*
*Часцей бы ступаць нам нагою босай,*
*Часцей бы да вас нам усім прычашчацца,*
*Ад бруду ўсялякага ачышчацца.*
*Лячыцца вашых крыніц чысцінёю*
*Ды матчынаю слязою святою.*

***К. Цвірка. Сцежкі маленства***

*Гучыць песня «Трэба дома бываць часцей», верш Р. Барадуліна, музыка І. Лучанка.*

**Вядучы 1.** Для любога з нас — дзіцяці, падлетка, юнака, пасівелага дарослага — самыя дарагія людзі на свеце, якія далі нам найкаштоўнейшае — жыццё, — гэта Бацька і Маці. Ва ўсе часы чалавек ратаваўся ад жыццёвых віхур і ўдараў лёсу ў сваёй

сям'і. Для Віктара Пятровіча яго апорай, глебай, духоўным стрыжнем быў яго бацька — Пётр Фёдаравіч. Ён фарміраваў розум і імкнуўся прадоўжыць сябе ў справах рук і розуму, уменні і прозвішчы сваіх сыноў.

**Чытальнік 3.**

*«З дзяцінства я здзіўляўся, гледзячы на бацьку. Мой тата штодня чытаў адну і тую ж кніжку. Яна была тоўстая, у цёмна-карычневых вокладках. Гэта была Біблія, ужо старая кніжка з пажаўцелымі старонкамі. З года ў год бачыў я перад татам яе на стале. Тата спрабаваў мне тлумачыць:*

*— У гэтай кнізе, сынок, усё што было, што ёсць і што будзе з намі. Яна дае сілу і ўпэўненасць. Кожны яе радок — гэта ісціна. Глядзі: хто любіць срэбра, той не насыціцца срэбрам, і хто любіць багацце, таму няма карысці ад гэтага…*

*Для таты яна была часткаю жыцця. Перад смерцю ён падарыў яе нашаму вясковаму ўрачу Сяргею Сяргеевічу. З надзеяй, што Біблія дапаможа яму ратаваць людзей не толькі ад цяжкіх хвароб, але і ад душэўных пакут. Кожны раз бачу, калі я ў доме Сяргея Сяргеевіча, гэту Кнігу кніг і быццам сустракаюся з татам…»*

***Віктар Супрунчук. Кніга кніг***

**Чытальнік 1.**

*«На Міжарэках у нас стаяў стажок сена, які мы нарабілі, лазячы па жывот у балоце. Пад здзек сляпакоў, камароў і машкарні. Калі мучыла смага, я піў ваду, якую набіраў у бутэльку ў Ясельдзе, праз сваю майку, нібы сіта, каб раптам жаба не трапіла ў рот. Але ж мы з татам, мамаю накасілі, згрэблі і састагавалі тое сена. І вось зіма, калі можна яго адвезці ў калгасны свіран, каб, нарэшце, атрымаць спажыву для нашай кароўкі. Умова была адна: не здаеш у калгас чатыры тоны сена — не атрымаеш сваіх дзве. Столькі патрэбна карміцельцы, каб перазімаваць.*

*Мы вязём з татам сена. Конь ідзе памалу. Ён стомлены, ледзь цягне за сабою вялікую гурбу сена, якое я шырока расклаў у бакі, утаптаў, каб найбольш улезла на сані.*

*На ферме, дзе трэба скласці сена, ужо цёмна. Аднекуль узнік старшыня:*

*— Скідвайце. Залічу вашы тоны…*

*…Ашукаў. Назаўтра сказаў, што ведаць не ведае пра якое сена размова.*

*Нават перад смерцю мой тата не мог забыць гэтай крыўды…»*

***Віктар Супрунчук. Сена***

**Вядучы 2.** Маці, Ганна Іосіфаўна — працаўніца, карміліца семярых дзяцей, заступніца, саграваючы праменямі сваёй любові ў цяжкія хвіліны, аддавала апошні кавалак, калі было галадна, засланяла грудзьмі ад смяротнай небяспекі.

**Чытальнік 2.**

*«Сапраўднае пекла апусцілася на вёску. Людзі ратаваліся як і дзе маглі. Мама з маімі старэйшымі братамі і сёстрамі схавалася на полі ў акопе. Распраставшы рукі, нібы птушка крылы, яна спрабавала сабой закрыць дзяцей. Пасля мама казала, што ў гэты момант думала толькі пра тое, як захаваць іх жыццё. Нават ахвяраваўшы сваім.*

*Вакол агонь. Гарыць сама зямля. Свіст куль і выбухі мін, снарадаў. Нешта прымусіла яе ўзняць галаву. Над акопам — немец з аўтаматам. Усё — канец… «Божа, дапамажы, злітуйся», — прашапталі знямелыя вусны. Мама на імгненне заплюшчыла вочы. Калі зноў глянула на немца, на яго твары былі спачуванне і слёзы. Ён махнуў рукою:*

*— Мутэр, мутэр, кіндэр! Хавайся! — дадаў чамусьці па-польску.*

*Немец крыкнуў і пабег у той бок, дзе яшчэ грымела страляніна. А праз нейкі час па вуліцы ўжо ішлі салдаты з чырвонымі зоркамі.*

*…Часам я заплюшчваю вочы і нібы бачу спрацаваныя, у жылах маміны рукі, што абдымаюць дзяцей, ратуючы іх».*

***Віктар Супрунчук. Рукі мамы***

**Вядучы 1.** Ваша сястра, Віктар Пятровіч, Вера Пятроўна расказвала нам, як маці заўсёды выходзіла з хаты на дарогу і выглядвала кагосьці з дарослых дзяцей, хто абяцаў прыехаць з розных куткоў свету.

**Чытальнік 3.**

*Ты прыйдзеш нечакана, як святло*
*Блакітнай зоркі ў мроіве вясеннім.*
*Тваіх вачэй адчую я цяпло,*
*Ты прыйдзеш нечакана, як святло*
*Блакітнай зоркі ў мроіве вясеннім.*
*Тваіх вачэй адчую я цяпло,*
*Перад табою стану на калені.*
*Я абдыму, пяшчотную, цябе,*
*У твой падол уб'юся галавою.*
*Рукой пагладзіш ціха па ілбе,*
*І стану раптам зноўку сам сабою,*
*Маленькім, неслухмяным, гаваркім.*
*Ад шчасця скалануся і заплачу…*
*Табе я абавязан сёння ўсім,*
*Калі хоць нешта на зямлі я значу.*

***Алег Салтук. Маці***

*Гучыць песня «Калыханка маме»,*
*верш Ніны Мацяш, музыка І. Вінаградавай.*

***Вядучы 2.*** *Аднаго з сыноў мнагадзетнай сялянскай* сям'і Супрунчукоў Віктара журналісцкія дарогі, жыццёвы вопыт, а найперш — талент і жаданне працаваць са словам прывялі ў вялікую літаратуру. На працягу сарака гадоў наш зямляк піша Кнігу жыцця простага чалавека. Гэта — абразкі, навелы, апавяданні, аповесці, раманы, эсэ.

**Вядучы 1.** У многіх творах празаіка мы сустракаем вобразы сваіх аднавяскоўцаў, сельчукоў, якіх пісьменнік памятае яшчэ з дзяцінства. Як ні чалавек — то лёс, неардынарны, нярэдка — трагічны.

**Вядучы 2.** У пошуках лягчэйшага лёсу перад вайною многія беларусы, у тым ліку і сельчукі, выязджалі за акіян, у Аргенціну, таму што не было зямлі. Бацькі Віктара Пятровіча збіраліся выехаць ва Уругвай, але перадумалі. З уласцівым пісьменніку прыродным пачуццём гумару Віктар Пятровіч у апошнім інтэрв'ю карэспандэнту раённай газеты «Маяк» Маргарыце Гаравой адказвае: «І я мог нарадзіцца ва Уругваі. У мяне нават ёсць апавяданне «У Парагвай, у цёплы край».

**Вядучы 1.** Гэтую гісторыю з трагічным фіналам немагчыма перачытваць без жалю і нават слёз.

**Чытальнік 1.**

*«І надышоў блаславёны дзень. Дзесяткі вазоў, напакаваных сціплым мужыцкім багаццем будучых перасяленцаў, з'ехаліся да станцыі Блудзень. Агледзеўшы гэту плойму людзей, Мікалай даўмеў, што сабраліся сяляне не толькі з іхняй вёскі. Убачыў знаёмых з Нарутавічаў, з Междулесся. Недзе павінен праз колькі гадзін падысці паравоз, на які Серафім заказаў білеты да Варшавы. Адтуль — да мора, а потым — на параход. Найбольш рашучыя дзядзькі знайшлі начальніка станцыі і даведаліся, што ніякі Серафім столькі білетаў да Варшавы не купляў. І, наогул, яго ніхто тут не бачыў. Дый паравоз да Варшавы будзе толькі заўтра».*

**Чытальнік 2.**

*«Здавалася, што ўсе вазы, якія з'ехаліся да чыгункі, зараз павернуць на яго і растопчуць. А гвалт і енк, што ўзнялі жанчыны і дзеці, абудзяць вёскі, адкуль выбраліся гэтыя людзі. Як неба абрынулася на зямлю. Мікалай зразумеў: ён з сям'ёю, а чакалі яшчэ дзіця, засталіся ні з чым. Што крывёю і цяжкім потам зарабіў, не купіўшы драбок цукру ці селядца да бульбы, аддаў Серафіму. Барадаты Сцяпан, які быў малатабойцам у Ёські, адарваў аглоблю ад воза і пайшоў на Мікалая. «Заб'ю, заб'ю!» — крычаў з пенаю на губах. А Парагвай, Парагвай быў зусім побач... Там цёпла круглый год і зямлі колькі жадае душа... Бліснула штосьці ў галаве Мікалая, і ён, ускочыўшы на воз, залямантаваў:*

*— У Парагвай, у Парагвай, у цёплы край!*

*І пайшоў у скокі, скідваючы з сябе кашулю, боты, штаны. Спыніўся барадаты Сцяпан, сціхлі перапалоханыя дзеці і жанчыны. Толькі Мікалай усё спяваў: — У Парагвай, у Парагвай, у цёплы край!»*

***Віктар Супрунчук. У Парагвай, у цёплы край***

**Вядучы 2.** Уласны літаратурны багаж кожны пісьменнік збірае ўласным жыццёвым вопытам, самаадукацыяй і чытаннем сапраўднай класічнай літаратуры. Мы ведаем, што на пісьменніка Віктара Супрунчука вельмі моцна ўздзейнічалі творы Льва Талстога, Фёдара Дастаеўскага, Джэка Лондана, Васіля Быкава, Івана Мележа. А невялічкае інтымнае апавяданне Івана Буніна «Солнечный удар», прачытанае ў юнацкія гады, зрабіла на будучага пісьменніка неверагоднае ўражанне.

**Вядучы 1.** Трэба адзначыць, калега, што многія чытачы знаюць Віктара Пятровіча як вельмі шчырага лірыка, майстра тонкага адлюстравання адносін паміж жанчынамі і мужчынамі. Ён знаходзіць незвычайныя сюжэты, характары, якія надоўга застаюцца ў памяці.

**Вядучы 2.** Так апавяданне «Вясковае каханне», якое ўпершыню было надрукавана ў газеце «Звязда» ў 2009 годзе (а мы чыталі яго ўголас), мела сярод чытацкай аўдыторыі ашаламляльны рэзананс. Горкі жаночы лёс вясковай прыгажуні Кацярыны кранае сэрца: жыццё з нялюбым мужам, маланкавае каханне з чужым мужчынай, яго здрада, фатальная хвароба жанчыны і яе перадсмяротнае ўсёдаруючае «дзякуй»...

**Чытальнік 3.**

*«Кацярына зайшла ў сваю хату і ледзь не страціла прытомнасць. На ўслоне ля печы сядзелі Уладзік і дзеці. Яна ўпала на калені перад імі і заплакала. Цяклі слёзы, але адразу знікалі: іх выціралі рукі самых дарагіх для яе людзей. Цяпер яна гэта зразумела.*

*Дні цяклі, як вада ў рэчцы. У клопаце, турботах. Ужо быццам і забыліся ў вёсцы пра іхні раман з Мазурам, але ж так проста тыя паўгода з сэрца не выкінеш. Не раз прачыналася Кацярына ад таго, што*



*плакала ў сне, сварылася з Мазурам і нават білася. Хоць да гэтага не дайшло. Бывала, пачуўшы цяжкае дыханне грузавіка, выходзіла ў двор і глядзела: а раптам ён?*

*Да Уладзіка, здавалася, вярнуліся светлыя і прыгожыя дні пасля вяселля. Такі стаў абыходлівы, ласкавы. Зубы пачаў чысціць. Як паголіцца, адэкалонам твар папырскае. Ездзіў у райцэнтр і адтуль вялізны букет прывёз. Здурнеў мужык, у двары сваіх мора. Нічога не сказала, падзякавала. Нават пацалавала. Дык ён да дванаццаці ночы калоў дровы.*

*...Свае астатнія дні яна ляжала і толькі плакала, маліла Уладзіка яе забіць альбо атруціць. Так ёй балела.*

*За некалькі гадзін да смерці Кацярына папрасіла, каб Уладзік паклікаў Мазура. Той падышоў да ложка, бледны, з дрыжачым падбародкам. На яе не глядзеў, маўчаў. Нарэшце вымавіў:*

*— Прабач...*

*— Дзякуй... — прашаптала Кацярына, але ўсе, хто стаяў недалёка, гэта таксама пачулі...»*

***Віктар Супрунчук. Вясковае каханне***

*Гучыць песня «Завушніцы»,*
*верш М. Танка, музыка У. Мулявіна.*

**Вядучы 1.** «Ляціць час, праходзіць жыццё. Гады з гарэзы-дзіцяці ператвараюць чалавека ў дзеда альбо бабулю. Аднак калі ў яго сапраўдная душа, ён мяняецца толькі знешне, а ўсярэдзіне застаецца такім, якім даў яму быць Усявышні», — гэтымі радкамі-меркаваннямі аўтара з першых старонак распачынаецца новая аповесць Віктара Супрунчука «Матчын век, або Дарога да Храма», якая пабачыла свет у 2011 годзе ў выдавецтве «Кнігазбор».

**Вядучы 2.** Гераіня гэтага твору — наша аднавяскоўка, васьмідзесяцігадовая Вольга Антонаўна Гаворка, мнагадзетная маці, удастоеная высокай духоўнай узнагароды — ордэна Крыжа Прападобнай Еўфрасінні Полацкай. Яна плыве па сваёй рацэ памяці, прыгадвае ўсё жыццё і ні за адзін дзень перажытага ёй не сорамна. І калі б можна было штосьці змяніць, павярнуць назад, усё аставіла б так, як і было, як ёсць.

**Чытальнік 1.**

*«Яна вельмі багатая. Дочкі і сыны, унукі і праўнукі — яе багацце. Ні з чым не параўнальнае, асаблівае. У гэтым багацці яе здароўе і хваробы, яе страх і слёзы, радасць і шчасце, боль, сабраны за многія гады жыцця. У ім сканцэнтравалася ўся душа яе. Гэта багацце — падарунак ёй за расстралянага тату, за памерлую зусім маладой маму, за яе згубленыя дзяцінства і маладосць».*

***Віктар Супрунчук.***
***Матчын век, або Дарога да Храма***

**Вядучы 1.** Паважаная аўдыторыя, да нашай сустрэчы вы, напэўна, звярнулі ўвагу, што мы прымеркавалі выставу «Бацька і Маці ад Бога ў хаце», дзе скарысталіся фотаздымкамі з сямейнага архіва Гаворкаў, якія прыязна даверыла нам гераіня кнігі — Вольга Антонаўна. Шкада толькі, што не засталося здымкаў любых таты і маці, якія далі жыццё Волечцы, сілу духа прайсці з годнасцю сваю нялёгкую, пакутную дарогу, веру ў Бога і павагу да людзей.

**Вядучы 2.** Аўтар аповесці сцвярджае адну з вечных ісцін: чалавека трымае на свеце, захоўвае яго душу бацькоўская любоў, ахвярнасць у імя сям'і і бацькі, і маці, вера: *«Яны пакутавалі, жылі і выжывалі, але ўсё роўна заставаліся людзьмі, з сумленнем, дабрынёй, узаемнай павагай. І ў большасці жылі светла, не трымаючы камень за пазухай». (**Віктар Супрунчук.**)*

**Вядучы 1.** Ёсць над чым задумацца ўсім нам, каб гэтая эстафета бацькоўскай мудрасці, працавітасці, высокай маральнасці і духоўнасці была падхоплена наступнымі пакаленнямі ўнукаў, праўнукаў.

**Чытальнік 2.**

*Цалуйце рукі любыя матуль,*
*Прапахлыя работаю і сонцам.*
*З душою, прачуленай да донца,*
*Цалуйце рукі любыя матуль.*
*Не забывайце, што для іх бясконца*
*Цяжэе вечных клопатаў хатуль.*
*Цалуйце рукі любыя матуль,*
*Прапахлыя работаю і сонцам.*

***М. Пазнякоў. Цалуйце рукі любыя матуль***

*Гучыць песня «Бацькоў не забывай»,*
*верш М. Ясеня, музыка Л. Захлеўнага.*

**Вядучы 2.** Паважаны Віктар Пятровіч! У Вас з сямейнай эстафетай усё добра, Вы шчаслівы чалавек: на літаратурную ніву бацькі-творца сёння сеюцца зерні-словы Вашага сына — філолага, перакладчыка.

Чытачам мы прапануем звярнуць увагу на дзесяты нумар 2013 года літаратурна-мастацкага часопіса «Нёман», дзе Ваша моцнае апавяданне «Мікалай Барада і конь Галубок» можна прачытаць па-руску ў перакладзе Мікіты Супрунчука. Можна пажадаць Вашаму сямейнаму тандэму творчых здабыткаў і дасягненняў, светлых душэўных імкненняў і чалавечага шчасця.

Запрашаем Вас да гутаркі з чытачамі, калі ласка!

## Дадатак № 1

Прыкладная распрацоўка
фота-кніжнай выставы-партфоліа

**«Віктар Супрунчук: па старонках уласных кніг і інтэрв'ю»**

«Творчасць — агромністае поле,
дзе кожнаму хапае месца».

*З інтэрв'ю газеце «Маяк»*
*ад 17 верасня 2011 г.*

**Раздзел 1. «Я нарадзіўся на Ясельдзе, прыгожай і светлай...»**

«З ракі маёй памяці».

*Раздзел прадстаўляе фотаздымкі пісьменніка з пары дзяцінства і юнацтва, яго сяброў па школе, эсэ-прысвячэнні роднай вёсцы.*

**Раздзел 2. «З дзяцінства я здзіўляўся, гледзячы на бацьку...»**

З эсэ «Парадоксы быцця». Кніга кніг.

**Раздзел 3. «... і нібы бачу спрацаваныя ў жылах, маміны рукі...»**

З эсэ «Парадоксы быцця». Рукі мамы.

*У другім і трэцім раздзелах размяшчаюцца фотаздымкі бацькоў Віктара Супрунчука, іх літаратурныя вобразы са старонак твораў сына-пісьменніка.*

**Раздзел 4. «Чытаючы сапраўдныя кнігі...»**

*Раздзел прадстаўляе пісьменнікаў і іх творы, якія фарміравалі літаратурны і мастацкі густ будучага празаіка. Гэта імёны Л. Талстога, Ф. Дастаеўскага, І. Буніна, А. Чэхава, Д. Лондана, В. Быкава.*

**Раздзел 5. «Мне пашэнціла трохі...»**

З эсэ «Парадоксы быцця». Да «гаспадара».

*У гэтым раздзеле можна знайсці галерэю імён літаратараў і ўспамінаў, эсэ аб іх пісьменніка В. Супрунчука, якія сустракаліся на яго жыццёвым і творчым шляху. Сярод іх М. Танк, І. Чыгрынаў, У. Караткевіч, І. Шамякін, В. Астаф'еў, Д. Гранін, Р. Казакова, М. Дудзін, А. Вольскі, А. Каско, А. Пісьмянкоў, Я. Пархута і інш.*

**Раздзел 6. «Пра каханне, якое заўжды кіруе светам»**

З газетнай публікацыі «Праз прызму чалавечых узаемаадносін».

*Чытачу прапануецца падборка апавяданняў пісьменніка аб адносінах паміж мужчынай і жанчынай, пра каханне: «Пад танец ваўкоў», «Цвіў белы- белы бэз», «Гарадское каханне», «Вясковае каханне», «Валя», «Цяжкія імёны», «Антонаўка з пахам маліны» і інш.*

**Раздзел 7. «Як ні чалавек, то лёс...»**

З аповесці «Дарога да Храма».

*Раздзел знаёміць з літаратурнымі партрэтамі сельчукоў — герояў твораў пісьменніка, яго землякоў. Іх можна знайсці ў наступных творах: «Мікалай Барада і конь Галубок», «Дзед Сашко», «Сяргей Сяргеевіч», «У Парагвай, у цеплы край», «Чатыры булачкі», «Матчын век, або Дарога да Храма».*

**Раздзел 8. «Словы льюцца лёгка...»**

З апошняга інтэрв'ю газеце «Маяк», 2011 г.

*Раздзел адлюстроўвае шэраг твораў пісьменніка, перакладзеных на рускую мову і надрукаваных у часопісе «Неман», а таксама апошніх апавяданняў са старонак газеты «Звязда».*

*Назвамі раздзелаў кніжнай выставы-партфоліа сталі радкі з розных твораў і інтэрв'ю пісьменніка.*

## Дадатак № 2

Прыкладная распрацоўка
выставы адной кнігі
**«Бацька і маці ад Бога ў хаце»**

Віктар Супрунчук. Матчын век, або Дарога да Храма.– Мінск: Кнігазбор, 2011.

*Цытата:* «Здаецца, нават смяялася і плакала, успамінаючы сваю дарогу на зямлі. Яна была і бацоцістай, і камяністай, і лёгкай, і шырокай, і вузенькай, як сцежка для аднаго чалавека. Гэтая дарога вяла яе, не давала некуды сысці, змяніць маршрут. Можа, яна і дайшла да гэтых дзён таму, што рухалася толькі для яе вызначаным шляхам. Шляхам любові да Бога, павагі да людзей. З радасцю сустракаючы кожны світанак, новы дзень, спазнаўшы кошт усяму, з чым давялося сутыкнуцца, і перадаўшы сваю мудрасць дзецям, каб яны, як эстафету, перадалі яе ўнукам, а тыя праўнукам».

Кніжная выстава прысвечана галоўнай гераіні аповесці Віктара Супрунчука «Матчын век, або Дарога да Храма» — Вользе Антонаўне Гаворка, жыхарцы в. Сялец, зямлячцы пісьменніка, шматдзетнай маці, якая ўдастоена высокай духоўнай узнагароды — ордэна Крыжа Прападобнай Еўфрасінні Полацкай.

Падраздзелы выставы, названыя цытатамі з твору, раскрываюць нялёгкі жыццёвы шлях васьмідзесяцігадовай жанчыны, якая лічыць сябе шчаслівым і багатым чалавекам: у яе сямёра сыноў і дочак, адзінаццаць унукаў і шэсць праўнукаў.

Выставу ўзбагачае мноства фотаздымкаў з сямейнага архіва гераіні, на якіх чытач убачыць прадстаўнікоў трох пакаленняў вялікай сям'і Гаворка, дастойных спадкаемцаў свайго прадзеда Антона, расстралянага фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Арганічна ўпішуцца ў выставачнае палатно і каляровы здымак Свята-Успенскай царквы в. Сялец, і Кніга кніг — Біблія, і партрэт прыхаджанкі храма Вольгі Антонаўны Гаворка з яе аднавяскоўкамі, удзельніцамі царкоўнага хора. Само жыццё прывяло яе да Бога. Толькі вера ў яго і малітвы, якім вучыла яе ў маленстве мама, заўжды трымалі жанчыну на гэтай зямлі.

**Раздзел 1. «Ёсць мама і тата. Гэта ж вялікае шчасце»**

**Раздзел 2. «... адразу забыліся гульні, дзяцінства»**

**Раздзел 3. «Праца і праца — гэта жыццё»**

**Раздзел 4. «Яна — маці, на руках яе дзіця»**

**Раздзел 5. «І паратунак знайшла ў малітвах»**

**Раздзел 6. «Дочкі і сыны, унукі і праўнукі — яе багацце»**

**А. ДРАГАН**
загадчык аддзелам
бібліятэчнага
маркетынгу ЦРБ,
г. Бяроза